✓**16 лютага** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя дакументальнага выдання **«Холокост в Беларуси: трагедия и память».** У зборнік увайшлі 517 дакументаў, што распавядаюць пра палітыку нацыстаў адносна яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі акупаванай Беларусі, яго знішчэнне, пасляваеннае расследаванне ўчыненых злачынстваў і захаванне памяці аб ахвярах Халакосту. Выданне падрыхтавана Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь пры ўдзеле Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь і архіўных устаноў нашай краіны.